**ДУК “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**

**Аддзел абслугоўвання і інфармацыі гарадской цэнтральнай бібліятэкі**

**Чытальная зала**

# *ЦУРКАНАЎ МІХАІЛ ВАСІЛЬЕВІЧ*



## *(ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)*

## ШОРТ-ЛІСТ

Пінск, 2023

Міхаіл Васільевіч Цурканаў нарадзіўся 5 лютага 1943 г. у в. Сухадол Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Бацька, машыніст цеплавоза, быў расстраляны немцамі за сувязь з партызанамі. Маці адна падымала дзяцей. Міша з маленства цягнуўся да музыкі, спяваў. Заўсёды быў вельмі актыўным у справах сваёй камсамольскай арганізацыі. За першую палучку купіў сабе гармонік, іграў на вясковых вечарынках. Яго нават для раённай газеты здымалі як перадавога пастуха, актывіста і музыку.

Каб умацаваць калгасную самадзейнасць, юнака накіравалі ў Мінск на курсы харэографаў. Вярнуўся Міхаіл Цурканаў у сваю вёску ўжо як спецыяліст, прыняў новы клуб. Арганізаваў самадзейнасць, ездзілі з канцэртамі па ўсёй акрузе.

Аднойчы, падчас выступлення ў Брэсце, яго заўважыў кіраўнік нядаўна створанага ў абласным цэнтры ансамбля танца «Радасць» Анатоль Міхайлавіч Вараб’ёў, прапанаваў перайсці ў свой калектыў. У праслаўленым калектыве Міхаіл Цурканаў адтанцаваў дзесяць гадоў. Потым стварыў свой калектыў — ансамбль песні і танца «Брастаўчанка». Неўзабаве яго зноў накіравалі на вучобу. На гэты раз курсы былі ў Маскве пры Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва. Пасля заканчэння вучобы паступіла некалькі прапаноў. Малады харэограф наведаў Баранавічы, Столін, яшчэ некалькі гарадоў, але выбраў Пінск.

У 1976 г. Міхаіл Цурканаў стварыў ансамбль песні і танца «Палескія зоры» пры будаўнічым трэсце № 2 (з 1991 г. ансамбль стаў працаваць пры Пінскім гарадскім Доме культуры). Ужо ў наступным годзе ансамбль быў удастоены ганаровага наймення «народны калектыў».

Ансамбль «Палескія зоры» мае мноства ўзнагарод, неаднаразова з’яўляўся пераможцам і лаўрэатам усесаюзных, міжнародных, рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў. З канцэртамі аб’ездзілі 20 краін свету. Міжнародная арганізацыя па народнай творчасці ўключыла «Палескія зоры» ў лік лепшых калектываў Еўропы. У 2006 г. за дасягненне высокага ўзроўню выканальніцкага майстэрства, актыўную гастрольна-канцэртную дзейнасць, прапаганду і развіццё самабытнай мастацкай культуры Беларусі «Палескія зоры» ўдастоены звання заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь.

Міхаіл Васільевіч займаўся песеннай творчасцю, выдаў тры зборнікі песень: «Палескія зоры» (2000), «Эх, Палясяначка!» (2015), «Мы з табой палешукі» (2015).

За шматгадовую творчую дзейнасць па прапагандзе і развіццю беларускага народнага вакальна-харэаграфічнага мастацтва М. В. Цурканаў быў узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». Яго работа і творчыя заслугі адзначаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, граматамі Міністэрства культуры БССР і Рэспублікі Беларусь.
У 1999, 2006 і 2017 гг. М. В. Цурканаў быў прызнаны «Чалавекам года» ў галіне культуры. Па выніках творчай работы за 2007 г. Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль песні і танца «Палескія зоры» быў занесены на гарадскую Дошку Гонару.
Званне «Ганаровы грамадзянін горада Пінска» Міхаілу Васільевічу прысвоена ў 2013 г. за асабісты ўклад у развіццё і прапаганду мастацкай самадзейнасці ў горадзе, шматгадовую добрасумленную працу па захаванню нацыянальных традыцый беларускага народа, высокі прафесіяналізм у працы.
Міхаіл Васільевіч умеў гадаваць таленты. Калі ў 2017 г. рашыў пакінуць работу і выйсці на пенсію, перадаў кіраўніцтва калектывам маладому музыканту Сяргею Пятровічу Паддубнаму, выпускніку Пінскага вучылішча мастацтваў.
10 лютага 2022 г. Міхаіла Васільевіча Цурканава не стала.
У канцы мая 2022 г. у Пінскім гарадскім Доме культуры адбыўся канцэрт ансамбля «Палескія зоры», прысвечаны памяці яго стваральніка і мастацкага кіраўніка М. В. Цурканава. Міхаіл Цурканаў і яго ансамбль – самыя яркія з’явы ў культурным жыцці Пінска. «Палескія зоры», якія запаліліся сорак пяць гадоў назад, вытрымалі іспыт часам і застаюцца візітоўкай самадзейнай мастацкай творчасці пінчукоў, па-ранейшаму зіхацяць на палескім небасхіле. Заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму ансамблю песні і танца «Палескія зоры» прысвоена імя М. В. Цурканава.


1. **Цурканов Михаил Васильевич** // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах Пинщины / [автор-составитель И. А. Кибак]. – Минск : Тонпик, 2004. – С. 145–146.
2. **Цурканаў, М. В.** Эх, Палясяначка! : песеннік / [сл. і муз.] Міхась Цурканаў ; [прадмова ад аўтара]. – Пінск : Пінская рэгіянальная друкарня, 2015. – 64, [2] с.
3. **Цурканаў, М. В.** Мы з табой палешукі : песеннік / Міхась Цурканаў. – Пінск : Пінская рэгіянальная друкарня, 2015. – 71, [2] с.
4. **Цурканаў, М. В.** Палескія зоры / [сл. і муз.] Міхаіл Васільевіч Цурканаў. – Брэст : Выдавецкі дом С. Лаўрова, 2000. – 14, [1] с.

5. **Чырвоная каліна** : зборнік твораў самадзейных кампазітараў Брэстчыны / ДзУК «Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр». – Брэст : Альтернатива, 2012. – 46 с. – Са зместу: Люблю да слёз : «Вярба зноў свае косы расплятае...» / музыка І. Гвоздіка ; словы М. Цурканава ; Спявай жа, Беларусь : «Дзе зерне сеецца, там будзе ўраджай...» / музыка І. Гвоздзіка ; словы М. Цурканава.
6. **Спявай, Берасцейшчына!** : зборнік твораў самадзейных кампазітараў Брэстчыны / ДзУК «Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр» ; [укладальнік Каржук С. В.]. – Брэст : Альтернатива, 2011. – 24 с. – Са зместу: Ой, кума-кума : «Зайшоў у хату куманёк, кліча куму у садок...» / музыка А. Палухіна ; словы М. Цурканава.
7. **Ансамбль песні і танца «Палескія зоры»** // Памяць. Пінск : гіст.-дакум. хроніка. Мінск, 1998. – С. 527.
8. **Ильенков, В.** На полесском небосклоне сиять его «Зорям» всегда / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2023. – 10 лютага (№ 6). – С. 15.
9. **Остановилось сердце мастера** : [некролог М. В. Цурканову] / подготовила Людмила Ребковец // Полесская правда. Пинск, 2022. – 12 февраля (№ 12). – С. 3.
10. **Цурканов Михаил Васильевич** (05.02.1943—10.02.2022) : [некролог] / Пинский городской исполнительный комитет, Пинский городской Совет депутатов // Пінскі веснік. – 2022. – 11 лютага (№ 6). С. – 12.
11. **Ильенков, В.** Рожденный под созвездием культуры : [Почетный гражданин г. Пинска, основатель народного ансамбля песни и танца «Полесские зори» М. В. Цурканов отметил 75-летие] / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2018. – 23 лютага (№ 16). – С. 3.
12. **Гришковец, В.** В кругу друзей : [Почетный гражданин Пинска, основатель народного ансамбля песни и танца «Полесские зори» М. В. Цурканов отметил 75-летие] / Валерий Гришковец // Заря. – 2018. – 17 февраля. – С. 8.
13. **Дзенісовіч, І.** Спявай і танцуй, Палессе! : [заслужаны ансамбль песні і танца «Палескія зоры»] / Ірына Дзенісовіч // Пінскі веснік. – 2017. – 2 чэрвеня. – С. 12.
14. **Ісаева, І.** Найвышэйшая адзнака — «Палескім зорам» : [заслужаны ансамбль песні і танца «Палескія зоры» прызнаны лепшым на фестывалі ў Польшчы] / Ірына Ісаева // Полесская правда. – Пинск, 2016. – 13 августа. С. – 11.
15. **Гришковец, В.** «Полесские зори» зажигают! : [заслуженный ансамбль песни и танца «Полесские зори» отметил 40-летие] / Валерий Гришковец // Заря. – 2016. – 4 июня. – С. 7.

16. **Ильенков, В.** Немеркнущие «Зори...» : [40-летие отметил заслуженный ансамбль песни и танца "Полесские зори"] / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2016. – 24 мая. – С. 6.
17. **Гришковец, В.** Когда поет душа... : [Михаил Цурканов издал три сборника песен] / Валерий Гришковец // Заря. – 2016. – 21 января. – С. 20.
18. **Гришковец, В.** «Полесские зори» загорелись ярче : [заслуженный ансамбль песни и танца из Пинска признан лучшим на фестивале в Польше] / Валерий Гришковец // Заря. – 2015. – 11 августа. – С. 2.
19. **Почетные граждане Пинска** : [Цурканов Михаил Васильевич] // Варяг- пресс. Пинск, 2015. – 6 марта (№ 10). – С. 4.
20. **Ильенков, В.** Виват, волшебник танца! : [70-летие М. В. Цурканова и решение о присвоении ему звания «Почетный гражданин г. Пинска»] / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2013. – 1 кастрычніка. – С. 1.
21. **Гришковец, В.** Почетному полку прибыло : [руководитель народного ансамбля песни и танца «Полесские зори» М. В. Цурканов удостоен звания «Почетный гражданин г. Пинска»] / Валерий Гришковец // Заря. – 2013. – 3 сентября. – С. 2.
22. **Гришковец, В.** «Полесские зори» Михаила Цурканова : [о руководителе заслуженного любительского коллектива Республики Беларусь народного ансамбля песни и танца «Полесские зори» М. В. Цурканове] / Валерий Гришковец // Заря. – 2013. – 16 февраля. – С. 8.
23. **Ильенков, В.** Кто «Зори...» зажигает? / В. Ильенков // Пінскі веснік. 2013. – 12 лютага. – С. 1–2.
24. **Куницкий, П.** Зори как вехи / Павел Куницкий // Вечерний Брест. – 2013. – 8 февраля. – С. 5.
25. **Гришковец, В.** Яркий свет «Полесских зорь» / Валерий Гришковец // Заря. 2007. 14 июня. С. 8.
26. **Шчарбакова, Т.** «Зор» васільковы вянок : [да 30-годдзя ансамбля песні і танца «Палескія зоры» Пінскага ГДК] / Тамара Шчарбакова // Пінскі веснік. – 2007. – 26 студзеня. – С. 3.
27. **Квитинская, Л.** Костер песни и танца / Людмила Квитинская // Полесская правда. – Пинск, 2007. – 24 января.
28. **Цурканаў, М. В.** Ззяйце ж, «Палескія зоры»! / Міхаіл Васільевіч Цурканаў ; гутарыла Алена Капачова // Культура. – 2006. – 14–20 студзеня. – С. 12.
29. **Цурканаў, М. В.** «Палескія зоры» – з ганаровым званнем! / Міхаіл Васільевіч Цурканаў ; гутарыла Алена Капачова // Народная трыбуна. – 2005. – 19 лістапада.

30. **Цурканов, М. В.** Удивительный свет «Полесских зорь» / Михаил Васильевич Цурканов ; беседовала Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2005. – 7 кастрычніка. – С. 4.
31. **Андреева, Н.** «Зори» становятся все ярче / Надежда Андреева // Мясцовы час. – Пінск, 2005. – 30 чэрвеня. – С. 6.
32. **Надеждин, Т.** Новая высота «Полесских зорь» / Тимофей Надеждин // Мясцовы час. – Пінск, 2004. – 19 жніўня. – С. 2.
33. **Шестакова, Н.** «Полесские зори» вновь покоряют Европу / Н. Шестакова // Полесская правда. – 2003. – 26 ноября. – С. 1.
34. **Ильенков, В.** Маэстро танца : [М. В. Цурканов] / Вячеслав Ильенков // Заря. – 2003. – 20 февраля. – С. 5.
35. **Ильенков, В.** Маэстро : [художественному руководителю ансамбля песни и танца «Полесские зори» М. В. Цурканову исполняется 60 лет] / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2003. – 7 лютага. – С. 1.

Выканаўца:

Каваленка Я. У., бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі
Жнівень, 2023 г.